# Гімназія № 13 Мінска і БДУІР пашыраюць супрацоўніцтва

06.03.2024 - 14:29Образование

**У гімназіі № 13 Мінска прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Сусветнаму дню інжынерыі, паведамляе карэспандэнт «Настаўніцкай газеты».**




— *Гэта не проста даніна павагі працы інжынераў, навукоўцаў, вынаходнікаў і іншых спецыялістаў сферы, прызнанне ўкладу, які ўносяць яны ва ўстойлівае развіццё чалавецтва, паляпшэнне побыту людзей і павышэнне якасці жыцця,* — адзначыла дырэктар гімназіі, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Марына Ільіна. — *Адкрыццё ў гімназіі ў 2023 г. профільных класаў інжынернай накіраванасці — крок да пабудовы комплекснай сістэмы бесперапыннай падрыхтоўкі інжынерных кадраў у ланцужку «школа — універсітэт — вытворчасць». Функцыянаванне адзінай пераемнай лічбавай адукацыйнай прасторы забяспечваецца прадуманай і апрабаванай на практыцы сістэмай арганізацыі адукацыйнага працэсу ад першага званка да студэнцкай лаўкі. Прыцягненне матэрыяльна-тэхнічных, кадравых рэсурсаў устаноў вышэйшай адукацыі і спецыялістаў IT-сферы выкарыстоўваецца як інструмент*

*павышэння якасці адукацыі і аптымізацыі адукацыйнага працэсу шляхам узмацнення практычнага складніка навучання. Стратэгія выхавання арыентавана на фарміраванне асобы гімназіста як носьбіта каштоўнасцей нацыянальнай культуры, грамадзяніна і патрыёта, яго сацыяльных кампетэнцый і маральнай сталасці. Прынцыпова новы комплексны падыход да рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця як педагагічнага інструмента прыцягнення падрастаючага пакалення да вырашэння сацыяльных праблем сучаснасці, прыняцця адказных рашэнняў і рэалізацыі ўласных планаў нацэльвае на выкананне патрабаванняў Стратэгіі развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі да 2030 г., надае ўніверсальны характар выхаваўчым дзеянням.*

Інжынерная справа з'яўляецца жыццёва важнай для дасягнення практычна ўсіх Мэт устойлівага развіцця. Невыпадкова сярод праведзеных мерапрыемстваў — круглы стол «Інжынерная справа на службе ўстойлівага развіцця». Ён прайшоў з удзелам навучэнцаў профільнага класа інжынернай накіраванасці, дырэктара гімназіі, педагогаў Аляксея Пархоменкі, Алены Бяспалай, прадстаўнікоў БДУІР: Тамары Парафіяновіч, кандыдата педагагічных навук, дацэнта кафедры інфармацыйных радыётэхналогій, Таццяны Дворнікавай, старшага выкладчыка кафедры, і студэнткі 2-га курса Настассі Кісцернай.

Школьнікі прынялі ўдзел у віктарыне «Прафесія — інжынер», дыялогавай пляцоўцы «Маё прызванне — інжынер», прафарыентацыйных гадзінах, лекцыях. Вынікам мерапрыемства сталі круглы стол «Мэтавая падрыхтоўка інжынерных кадраў: размова зацікаўленых» і абмеркаванне перспектыўных планаў супрацоўніцтва гімназіі № 13 і БДУІР, накіраваных на ўмацаванне і пашырэнне партнёрскіх адносін у пытаннях падрыхтоўкі будучых кваліфікаваных інжынерных кадраў.

**Наталля КАЛЯДЗІЧ**
**Фота прадастаўлена гімназіяй № 13 Мінска**